**РЭГЛАМЕНТ КОНКУРСУ Ў РАМКАХ АДКРЫТАГА НАБОРУ Ў РЭЗІДЭНЦЫЙНУЮ ПРАГРАМУ**
**WARSZAWSKIE OBSERWATORIUM KULTURY**
**ПАД НАЗВАЙ „REZYDENCJE WOK 2026"**

**1. Конкурсная працэдура Праграмы рэзідэнцый WOK:**

1. Конкурсная працэдура складаецца **з двух этапаў**.

2. **Першым этапам** Конкурсу з'яўляецца фармальная і зместавая ацэнка пададзеных заявак, якую праводзіць Конкурсная камісія, прызначаная Дырэктаркай WOK.

3. Запоўненую заяўку з апісаннем канцэпцыі неабходна даслаць разам з партфоліа / прафесійнай біяграфіяй у фармаце PDF (не больш за 10 МБ) праз сайт www.wok.art.pl не пазней за **16 лютага 2026 г. да 11:59**.

4. Калі асоба, якая ўдзельнічае ў дадзеным Конкурсе, не мае магчымасці даслаць файл электронным шляхам у спосаб, апісаны ў п. 3 вышэй, просім звязацца па тэлефоне: +48 730 390 411 або +48 730 390 602 альбо па электроннай пошце: aleksandra.wiechowska@wok.art.pl або sviatlana.haidalionak@wok.art.pl з мэтай, каб прадстаўніца WOK дапамагла знайсці магчымы спосаб падачы заяўкі разам з партфоліа / прафесійнай біяграфіяй у вызначаны тэрмін.

5. Конкурсная камісія WOK, прызначаная Дырэктаркай WOK, адбярэ не больш за 20 заявак для ўдзелу ў **другім этапе** Конкурсу. Склад Конкурснай камісіі WOK будзе абвешчаны не пазней за дзень апублікавання вынікаў першага этапу Конкурсу на сайце WOK, а менавіта **27 лютага 2026 г.**

6. Другім этапам Конкурсу з'яўляюцца сумоў'і Конкурснай камісіі WOK з аўтаркамі і аўтарамі адабраных заявак.

7. Сумоў'і ў другім этапе Конкурсу будуць праводзіцца анлайн і кожная будзе доўжыцца каля 30 хвілін. Сумоў'е будзе датычыцца разважанняў, звязаных з тэмай рэзідэнцыі бягучага года, ідэі працэсу рэзідэнцыі і патрэбаў асоб, якія падалі канцэпцыі. Дакладныя даты сумоў'яў будуць узгоднены індывідуальна з кожнай асобай, запрошанай да другога этапу Конкурсу.

8. Адбор асоб, рэкамендаваных да ўдзелу ў Рэзідэнцыйнай праграме (не больш за 10 асоб), ажыццяўляе Конкурсная камісія WOK. Асноўным крытэрыем адбору з'яўляецца адпаведнасць пададзенай канцэпцыі мэтам Рэзідэнцыйнай праграмы WOK.

9. Дадаткова Камісія абірае дзве заяўкі, якія будуць уключаныя ў рэзервовы спіс.

10. Умовай удзелу ў Рэзідэнцыйнай праграме WOK з’яўляецца падпісанне асобамі, адабранымі ў гэтым Конкурсе, **дамовы** з WOK (падрыхтаванай WOK), у якой будуць вызначаны, у прыватнасці, аб’ём падтрымкі, умовы выплаты фінансавай падтрымкі, а таксама правілы карыстання WOK вынікамі рэзідэнцыйнага працэсу, якія маюць творчы характар (аўтарскія правы), і права на публікацыю выявы асобы-рэзідэнта.

**2. Графік Конкурсу і Рэзідэнцыйнай праграмы WOK:**

Праграма “Rezydencje WOK 2026” складаецца з працэсу набору (люты-сакавік) і двух тураў рэалізацыі рэзідэнцый: вясновага (красавік, май і чэрвень) і восеньскага (верасень, кастрычнік і лістапад). Асоба, якая ўдзельнічае ў Конкурсе, у заяўцы пазначае тур, у якім бы хацела прыняць удзел. Канчатковае рашэнне адносна выбару тура прымае WOK.

1. Пачатак адкрытага набору ў Праграму “Rezydencje WOK 2026” усталёўваецца на **2 лютага 2026 г. (панядзелак).**
2. Тэрмін падачы заяўкі ў WOK усталёўваецца да **16 лютага 2026 г. (панядзелак) да 11:59.**
3. Абвяшчэнне вынікаў першага этапу Конкурсу адбудзецца да **27 лютага 2026 г.**
4. Правядзенне сумоў'яў з выбранымі аўтаркамі і аўтарамі заявак першага этапу адбудзецца ў перыяд **з 2 да 13 сакавіка 2026 г.**
5. Абвяшчэнне спісу адабраных асоб-рэзідэнтаў разам з рэзервовым спісам адбудзецца да **27 сакавіка 2026 г.**

**3. Скаргі:**

1. Усе скаргі, звязаныя з дадзеным Конкурсам, могуць падавацца ў час яго правядзення і на працягу 3 дзён пасля яго завяршэння.

2. Скаргі можна падаваць па электроннай пошце на адрасы: sviatlana.haidalionak@wok.art.pl або aleksandra.wiechowska@wok.art.pl або заказным лістом на адрас WOK: ul. Mokotowska 29a, 00-560 Warszawa.

3. Скарга павінна месціць імя і прозвішча, а таксама кантактныя дадзеныя асобы, якая ўдзельнічае ў Конкурсе. У тэксце скаргі неабходна ўказаць прычыну скаргі з кароткім апісаннем сітуацыі. У выпадку адсутнасці неабходных звестак WOK пакідае за сабой права запатрабаваць неадкладнае дапаўненне скаргі. Недаапаўненне скаргі на працягу 3 дзён з моманту атрымання скаргі дае WOK права пакінуць скаргу без разгляду.

4. Скаргі разглядаюцца на працягу 14 дзён з моманту іх атрымання WOK. Асоба, якая падала скаргу, будзе праінфармавана пра рашэнне WOK у той жа форме, у якой была пададзена скарга (па электроннай пошце або заказным лістом).

**4. Заключныя палажэнні:**

1. Правілы апрацоўкі персанальных дадзеных асоб, якія ўдзельнічаюць у Конкурсе, вызначаны ў інфармацыйнай клаўзуле, якая з’яўляецца дадаткам № 2 да гэтага Рэгламенту.

Дасыланне заяўкі азначае, што асоба, якая ўдзельнічае ў Конкурсе, азнаёмілася з інфармацыйнай клаўзулай, якая з'яўляецца неад'емнай часткай гэтага Рэгламенту.

2. WOK пакідае за сабой права ўносіць змены ў гэты Рэгламент у выпадку наяўнасці важнай прычыны для такіх змен.

3. WOK пакідае за сабой права змяняць тэрміны, указаныя ў Графіку Конкурсу (п. 2 гэтага Рэгламенту), а таксама адклікаць Конкурс па арганізацыйных прычынах.

4. Канчатковыя рашэнні адносна тлумачэння Рэгламенту і ў пытаннях, не ўрэгуляваных гэтым Рэгламентам і звязаных з дадзеным Конкурсам, належаць WOK.

5. Неад'емнай часткай Рэгламенту з'яўляюцца:

– дадатак № 1 – анкета-заяўка;
– дадатак № 2 – інфармацыйная клаўзула аб апрацоўцы персанальных дадзеных.

Усе пытанні, звязаныя з Конкурсам, просім накіроўваць на адрасы электроннай пошты: aleksandra.wiechowska@wok.art.pl або sviatlana.haidalionak@wok.art.pl.

** У выпадку разыходжанняў паміж тэкстам на польскай мове і тэкстам на беларускай мове, польская версія лічыцца юрыдычна абавязковай і мае сілу закона.*

*Дадатак № 1 да Рэгламенту Конкурсу ў межах Праграмы "REZYDENCJE WOK 2026"*

**ЗАЯВАЧНЫ ФАРМУЛЯР**

1. Імя і прозвішча:
   .........................................................
2. Кантактныя даныя:

e-mail: ..........................................
нумар тэлефона: .......................................

3. Ці падаеце Вы заяўку разам з іншымі асобамі?
   ТАК / НЕ
4. Калі ТАК, пазначце даныя іншых асоб (імя і прозвішча, e-mail, кантактны тэлефон):

.....................................................
.....................................................
.....................................................

5. У якім туры Вы жадаеце правесці рэзідэнцыю?
- ВЯСНОВЫМ (красавік, май, чэрвень)
- ВОСЕННЫМ (верасень, кастрычнік, лістапад)
- абедзве опцыі мне падыходзяць
6. Як Вы разумееце тэму сёлетняй рэзідэнцыйнай праграмы?
   (максімум 1800 знакаў з прабеламі)

.........................................................

7. Апішыце Вашу агульную канцэпцыю рэзідэнцыйнага працэсу
   (максімум 1800 знакаў з прабеламі):

.........................................................

8. Адкуль Вы даведаліся пра праграму?

.........................................................

Далучыце файл з партфоліа / CV (максімум 10 МБ).
Назву файла пачніце з вашага прозвішча або назвы калектыву.

9. Я даю згоду на апрацоўку маіх персанальных дадзеных, указаных у гэтай заяўцы, у мэтах, звязаных з правядзеннем конкурсу ў межах рэзідэнцыйнай праграмы «REZYDENCJE WOK 2026».

Згодна з арт. 13 Рэгламенту Еўрапейскага парламента і Савета (ЕС) 2016/679 ад 27 красавіка 2016 г. аб абароне фізічных асоб у сувязі з апрацоўкай персанальных дадзеных і аб свабодным перамяшчэнні такіх дадзеных і аб скасаванні дырэктывы 95/46/ЕС (Агульны рэгламент аб абароне дадзеных — GDPR), паведамляем, што Адміністратарам персанальных дадзеных з’яўляецца Warszawskie Obserwatorium Kultury, вул. Mokotowska 29a, 00-560 Варшава. Па ўсіх пытаннях, звязаных з апрацоўкай персанальных дадзеных, можна звяртацца да Інспектара па абароне дадзеных па адрасе e-mail: iod@wok.art.pl. Вашы персанальныя дадзеныя (імя, прозвішча, адрас электроннай пошты і нумар тэлефона) будуць апрацоўвацца з мэтай арганізацыі і правядзення конкурсу ў межах рэзідэнцыйнай праграмы Rezydencje WOK 2026 і ацэнкі працэсу набору ўдзельнікаў на падставе арт. 6, ч. 1, літ. a GDPR. Атрымальнікамі персанальных дадзеных могуць быць суб’екты, якія апрацоўваюць дадзеныя па даручэнні Адміністратара, выключна ў межах дамоваў аб перадачы апрацоўкі персанальных дадзеных, а таксама органы і ўстановы, упаўнаважаныя на атрыманне дадзеных на падставе закона. Персанальныя дадзеныя будуць захоўвацца на працягу тэрміну, вызначанага Інструкцыяй справаводства і Адзіным рэчавым пералікам дакументаў, або да моманту адклікання згоды. Персанальныя дадзеныя не будуць перадавацца ў трэція краіны або міжнародным арганізацыям. Пры апрацоўцы персанальных дадзеных не адбываецца аўтаматызаванага прыняцця рашэнняў, у тым ліку прафілявання. Падача персанальных дадзеных з’яўляецца добраахвотнай, але неабходнай для разгляду заяўкі на ўдзел у конкурсе. Вы маеце права ў любы момант адклікаць згоду на апрацоўку вашых персанальных дадзеных у межах, у якіх яны апрацоўваюцца на падставе вашай згоды. Адкліканне згоды не ўплывае на законнасць апрацоўкі, якая была ажыццёўлена да моманту яе адклікання. Вы маеце права на доступ да сваіх персанальных дадзеных, на іх выпраўленне, на абмежаванне апрацоўкі, на выдаленне сваіх персанальных даных, на перанос персанальных дадзеных. У выпадку неправамернай апрацоўкі персанальных дадзеных вы маеце права падаць скаргу ў дзяржаўны наглядны орган па абароне дадзеных — Прэзідэнту Упраўлення па абароне персанальных дадзеных (Prezes Urzędu Ochrony Danych Osobowych).

*Дадатак № 2 да Рэгламенту конкурсу ў межах праграмы “REZYDENCJE WOK 2026”*

**Інфармацыйная клаўзула**

Выконваючы абавязак, пра які ідзе гаворка ў арт. 13 ч. 1 Рэгламенту Еўрапейскага парламента і Савета (ЕС) 2016/679 ад 27 красавіка 2016 г. аб абароне фізічных асоб у сувязі з апрацоўкай персанальных дадзеных і аб свабодным перамяшчэнні такіх дадзеных, а таксама аб скасаванні дырэктывы 95/46/ЕС (Агульны рэгламент аб абароне дадзеных) (Афіц. вестнік ЕС L 119 ад 04.05.2016, с. 1) («**GDPR**»), паведамляем, што:

1. Адміністратарам персанальных дадзеных з’яўляецца Warszawskie Obserwatorium Kultury, ul. Mokotowska 29a, 00-560 Warszawa, уключанае ў Рэестр Інстытуцый Культуры горада Варшавы пад нумарам RIA/166/91, NIP: 5251000514, REGON: 010941634 («**WOK**»). З намі можна звязацца наступнымі спосабамі:

a. паштовым лістом: ul. Mokotowska 29a, 00-560 Warszawa,

b. па электроннай пошце: biuro@wok.art.pl,

c. па тэлефоне: +48 22 6203490.

2. З інспектарам па абароне персанальных дадзеных WOK можна звязацца па электроннай пошце: iod@wok.art.pl.
3. Мы будзем апрацоўваць персанальныя дадзеныя ў выглядзе імя, прозвішча і кантактных дадзеных, змешчаных у заяўным фармуляры, на падставе арт. 6 ч. 1 літара a) GDPR у сувязі з дадзенай згодай, з мэтай правядзення конкурсу ў межах праграмы пад назвай “REZYDENCJE WOK 2026”.
4. Атрымаць персанальныя дадзеныя могуць суб’екты, якія апрацоўваюць гэтыя дадзеныя па нашым даручэнні на падставе дамоваў аб даручэнні апрацоўкі персанальных дадзеных, партнёры конкурсу, а таксама органы дзяржаўнай адміністрацыі, упаўнаважаныя на атрыманне дадзеных на падставе агульнаабавязковых нормаў права.
5. Персанальныя дадзеныя будуць захоўвацца да моманту адклікання згоды або на працягу перыяду, неабходнага для рэалізацыі мэтаў, указаных у пункце 3 вышэй.
6. У сувязі з апрацоўкай персанальных дадзеных вам належаць наступныя правы:

- правa доступу да сваіх дадзеных і атрымання іх копіі,
- права на выпраўленне (карэкціроўку) сваіх дадзеных,
- права на выдаленне персанальных дадзеных у выпадку, калі апрацоўка дадзеных не ажыццяўляецца з мэтай выканання абавязку, які вынікае з нормы права, або ў межах ажыццяўлення публічнай улады,
- права на абмежаванне апрацоўкі дадзеных,
- права на перанос сваіх дадзеных,
- права на падачу скаргі Прэзідэнту Упраўлення па абароне персанальных дадзеных,
- права на адкліканне згоды ў любы момант без уплыву на законнасць апрацоўкі, якая была ажыццёўлена на падставе згоды да яе адклікання.

7. Падача персанальных дадзеных з’яўляецца добраахвотнай. У выпадку, калі персанальныя дадзеныя не паданыя, удзел у конкурсе, пра які ідзе гаворка ў пункце 3 вышэй, будзе немагчымы.
8. Персанальныя дадзеныя не будуць апрацоўвацца аўтаматызаваным спосабам, у тым ліку ў форме прафілявання.
9. Вашы персанальныя дадзеныя не будуць перадавацца ў трэція краіны або міжнародным арганізацыям.